**ВОДЗЫЎ АФІЦЫЙНАГА АПАНЕНТА**

аб дысертацыі Мурашкі Наталлі Уладзіміраўны
«Мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі», прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук
па спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання (вучнёўскай і студэнцкай моладзі)

**Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны, са спасылкай на вобласць даследавання пашпарта адпаведнай спецыяльнасці, зацверджанага ВАК**

Прадстаўленая дысертацыя Н.У. Мурашкі «Мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі» адпавядае заяўленай спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання (вучнёўскай і студэнцкай моладзі) і галіне «Педагагічныя навукі». Зрабіць такую выснову дазваляе аналіз структуы і зместу дысертацыі, логікі даследавання, разгляд саіскальнікам у якасці *галоўнага індыкатара функцыянавання маўленчага адукацыйнага асяроддзя* сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў. Такім чынам, працэс мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя азначае ў дысертацыйным даследаванні кіраванне равіццём асобы, што падмацоўваецца распрацоўкай методыкі фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў пачатковых класаў сродкамі фальклору.

Згодна з пашпартам спецыяльнасці, галіна даследавання дысертацыі суадносіцца з пунктам 2 «Тэорыя і методыка выхавання вучнёўскай і студэнцкай моладзі».

**Актуальнасць тэмы дысертацы**

Дысертацыя Н.У. Мурашкі, прысвечаная мадэляванню маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору ў пачатковай школе, мае несумненную навуковую, сацыяльную і адукацыйную значнасць. Актуальнасць даследавання абумоўлена, перш за ўсё, сучаснымі прыярытэтамі беларускай дзяржавы ў сферы адукацыі, накіраванымі на выхаванне гарманічна развітай асобы ва ўмовах білінгвальнага асяроддзя. Паколькі ў Рэспубліцы Беларусь статус дзяржаўнай маюць дзве мовы – руская і беларуская, – фарміраванне ў падрастаючага пакалення ўстойлівых навыкаў свабоднага валодання абедзвюма

мовамі з'яўляецца найважнейшай грамадскай задачай. У гэтым кантэксце асаблівую значнасць набывае стварэнне эфектыўных педагагічных умоў для падтрымкі і развіцця беларускай мовы, якая, паводле статыстычных даных, значна менш ужываецца беларусамі. Даследаванне Н. У. Мурашкі напрамую адказвае названай патрэбе, прапаноўваючы канкрэтны механізм, які спрыяе станаўленню білінгвальнай асобы, для якой беларуская мова з'яўляецца не проста прадметам вывучэння, а жывым сродкам зносін і далучэння да нацыянальнай культуры.

З навукова-педагагічнага пункту гледжання актуальнасць працы вызначаецца наяўнасцю пэўнага прабелу ў тэорыі і методыцы навучання. У навуковай літаратуры дастаткова падрабязна разгледжаны такія паняцці, як «адукацыйнае асяроддзе» і «маўленчае/моўнае асяроддзе». Аднак іх сінтэз ў мэтах цэласнай катэгорыі «маўленчае адукацыйнае асяроддзе» (якой уласцівы ўласныя структурныя і функцыянальныя характарыстыкі), раней не выступаў прадметам спецыяльнага даследавання. Дысертант прадпрымае прадуктыўныя дзеянні па тэарэтычным асэнсаванні і аперацыяналізацыі гэтага паняцця, што з'яўляецца несумненным укладам у развіццё тэорыі навучання і выхавання, канкрэтна – у рамках спецыяльнасці 13.00.02. Пастаўленая дысертантам мэта дазваляе перайсці ад разрозненых даследаванняў асяроддзя і маўлення да комплекснага мадэлявання працэсу маўленчага развіцця праз маўленчае адукацыйнае асяроддзе.

Не менш важным уяўляецца абраны аўтарам інструмент мадэлявання – беларускі фальклор. Ва ўмовах актыўнай глабалізацыі і лічбавізацыі дзяцінства зварот да аўтэнтычных форм народнай культуры выступае дзейсным спосабам захавання нацыянальнай ідэнтычнасці і эмацыйнага здароўя ва ўмовах даволі агрэсіўнай інфармацыйнай прасторы. Фальклор, валодаючы велізарным выхаваўчым і развіваючым патэнцыялам, натуральным і арганічным спосабам уводзіць дзіця ў прастору роднай мовы. Выкарыстанне разнастайных фальклорных жанраў не толькі ўзбагачае слоўнікавы запас і развівае маўленчыя механізмы, але і абуджае эмацыйны водгук, фарміруе каштоўнаснае стаўленне да мовы як падмурка культурнай спадчыны. Такім чынам, дысертацыя ўносіць істотны ўклад і ў методыку выхавання, прапаноўваючы сучасныя падыходы і спосабы інтэграцыі этнакультурнага кампанента ў адукацыйны працэс.

Правядзенне навуковага пошуку ў дачыненні да пачатковай школы з'яўляецца, на наш погляд, метадалагічна абгрунтаваным і заканамерным рашэннем. Малодшы школьны ўзрост прызнаецца сензітыўным перыядам для

маўленчага развіцця асобы, фарміравання яе каштоўнасных арыентацый. Закладзеныя ў гэты перыяд асновы білінгвальнасці і маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, падмацаваныя станоўчымі эмоцыямі ад узаемадзеяння з фальклорам, становяцца трывалым падмуркам для далейшага асобаснага і культурнага развіцця вучня. Практычную значнасць даследавання пацвярджаюць распрацаваныя дысертантам мадэль і методыка, якія можна ўкараняць у масавую адукацыйную практыку для павышэння эфектыўнасці навучання беларускай мове (ва ўмовах ўрочнай і пазакласнай дзейнасці), выхавання дзяцей як паўнавартасных грамадзян, якія любяць сваю краіну і яе культуру.

**Ступень навізны вынікаў дысертацыі і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону**

Навуковая навізна дысертацыі як педагагічнага даследавання забяспечваецца рэлізацыяй міждысцыплінарнага падыходу. Так сутнасць маўленчага адукацыйнага асяроддзя вызначаецца з пазіцыі псіхолага-педагагічных і лінгвадыдактычных ведаў.

Патэнцыял фальклору для мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя раскрыты ў трох напрамках: мэтавым (уплыў на каштоўнасна-мэтавыя ўстаноўкі і матывы авалодання беларускай мовай), змястоўным (адлюстроўвае асаблівасці ўплыву яго зместу на фарміраванне маўленчых і камунікатыўных ўменняў, уяўленняў пра нацыянальную культурную спадчыну), дзейнасным (авалоданне вучнямі ўсімі відамі маўленчай дзейнасці і актывізацыі камунікатыўных уменняў праз творчую і гульнявую дзейнасць) з ўлікам асаблівасцей малодшага школьнага ўзросту.

Упершыню ў навуцы дадзена тэарэтычнае абгрунтаванне стварэння беларускага маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ва ўстановах з рускай мовай навучання і выхавання. Распрацаваная структурна-функцыянальная мадэль уключае мэтавы, рэгулятыўны, змястоўны, працэсуальны і выніковы блокі, кожны з якіх характарызуе педагагічную дзейнасць з улікам выдзеленых кампанентаў маўленчага адукацыйнага асяроддзя. Прапанаваная мадэль характарызуецца структурнай цэласнасцю, функцыянальнасцю, універсальнасцю, алгарытмічнасцю.

Навуковая навізна дысертацыі заключаецца таксама ў выніках эмпірычнага даследавання і іх якасным аналізе, якія даюць ўяўленне аб узроўні сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі сучасных вучняў

пачатковых класаў і найбольш актуальных напрамках педагагічнай работы ў сувязі з атрыманымі данымі.

Палажэнні, якія выносяцца на абарону, цалкам карэлююць з заяўленымі ў дысертацыі задачамі. Змест палажэнняў пацвярджаецца праведзеным даследаваннем.

**Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі**

Дакладнасць навуковых вынікаў, абгрунтаванасць высноў і рэкамендацый забяспечваецца:

– шырынёй прааналізаваных навуковых і навукова-метадычных публікацый па тэме даследавання (164 адзінкі), якія дазволілі з улікам дасягненняў сучаснай тэорыі і практыкі вызначыць сутнасць і струкуру маўленчага адукацыйнага асяроддзя, выявіць і абгрунтаваць патэнцыял фальклору для мадэлявання адукацыйнага асяроддзя на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў школах з рускай мовай навучання і выхавання, сканструяваць структурна-функцыянальную мадэль стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя;

– дастатковым аб’ёмам выбаркі ўдзельнікаў эмпірычнага даследавання (247 чалавек, з якіх 238 вучняў і 9 настаўнікаў пачатковых класаў г. Мінска, Мінскай і Віцебскай абласцей);

– працягласцю эксперыментальнай дзейнасці (са студзеня 2023 г. да мая 2024 г.);

– уключэннем у дадатак вынікаў дыягнастычных зрэзаў на розных этапах эксперыменту (вынікі метаду «Ранжыраванне», вынікі методыкі «Настрой», вынікі анкетавання «Дыягностыка ўзроўню цікавасці», вынікі сфарміраванасці моўных ведаў, вынікі методыкі «Вывучэнне звязнага маўлення», вынікі методыкі М.А. Паваляевай «Назіранне за свабоднымі зносінамі», вынікі методыкі «Рэфлексіўная мішэнь», вынікі матэматычнай апрацоўкі дадзеных на кантрольным этапе эксперымента);

– разнастайнасцю выкарыстаных метадаў даследавання (тэарэтычных, эмпірычных, матэматычнай статыстыкі).

Адзначаныя аспекты дазваляюць ацаніць высновы і рэкамендацыі, прапанаваныя саіскальнікам, як аб’ектыўныя, дакладныя і абгрунтаваныя.

**Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні**

*Навуковая значнасць* вынікаў дысертацыі заключаецца ва ўзбагачэнні тэорыі выхавання і навучання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

У прыватнасці, навуковае значэнне маюць наступныя вынікі:

– раскрыццё сутнасці і структуры феномена «маўленчае адукацыйнае асяроддзе», што дае магчымасць больш глыбокага асэнсавання пытанняў, звязаных з адукацыйным асяроддзем;

– выяўленне патэнцыялу фальклору для мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя і яго прадстаўленне ў трох ракурсах: мэтавым, змястоўным, дзейнасным;

– распрацоўка структурна-функцыянальнай мадэлі стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ва ўмовах вучэбных заняткаў і пазакласнай дзейнасці;

– вызначэнне ўзроўняў і крытэрыяў ацэнкі сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетенцыі вучняў малодшага школьнага ўзросту як асноўнага індыкатара выніковасці функцыянавання маўленчага адукацыйнага асяроддзя ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання.

*Практычная значнасць* вынікаў дысертацыйнага даследавання заключаецца ў тым, што распрацаваныя мадэль і модульная методыка фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі праз вывучэнне фальклору ўкаранёны ў адукацыйны працэс пяці ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі (у Мінску, Мінскай і Віцебскай абласцях). Распрацаванае метадычнае забеспячэнне прадстаўлена праграмай аб'яднання па інтарэсах для I–IV класаў, двума метадычнымі дапаможнікамі для настаўнікаў, зместам аўтарскага сайта «Фальклорная скарбонка» (https://folkskarbonka.by).

*Эканамічная значнасць* вынікаў дысертацыі вызначаецца тым, што рэалізацыя модульнай методыкі фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі праз вывучэнне фальклору ажыццяўляецца галоўным чынам ў рамках адукацыйнага працэсу і не патрабуе дадатковых сродкаў, што пацверджана ў ходзе эксперыментальнай работы.

*Сацыяльная значнасць* вынікаў дысертацыі заключаецца ў выхаванні ў вучняў малодшага школьнага ўзросту нацыянальнай самасвядомасці, каштоўнаснага стаўлення да Радзімы, беларускай традыцыйнай культуры, мовы.

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны для развіцця тэорыі і методыкі пачатковай адукацыі, у адукацыйнай практыцы ўстаноў агульнай

сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання, установ вышэйшай адукацыі (спецыяльнасць «Пачатковая адукацыя»).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку**

Вынікі дысертацыі прадстаўлены ў 21 публікацыі. З іх ліку 6 публікацый адпавядаюць патрабаванням пункта 19 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь. Сярод іншых прац – 2 артыкулы у навуковых часопісах, 11 артыкулаў у матэрыялах навукова-практычных канферэнцый, 2 метадычныя дапаможнікі. Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў складае 15,64 аўтарскага аркуша.

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК**

Дысертацыйнае даследаванне Н.У. Мурашкі адпавядае патрабаванням Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь. У працы прыводзяцца спасылкі з указаннем аўтараў і крыніц, матэрыялы якіх выкарыстоўваюцца ў дысертацыі, а таксама спасылкі на ўласныя публікацыі, у якіх змяшчаюцца матэрыялы дысертацыйнага даследавання.

Афармленне дысертацыі і аўтарэферата адпавядае патрабаванням «Інструкцыі аб парадку афармлення дысертацыі, дысертацыі ў выглядзе навуковага даклада, аўтарэферата дысертацыі і публікацый па тэме дысертацыі», зацверджанай пастановай Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 22 жніўня 2022 г. № 5.

**Заўвагі па дысертацыі (пры іх наяўнасці), калі яны не паказваюцца ў структурных элементах водзыва аб дысертацыі**

Ацэньваючы ў цэлым станоўча прадстаўленую дысертацыю, лічым неабходным зрабіць наступныя заўвагі.

1) На наш погляд, лексічна не зусім дакладна дадзены назвы структурных кампанентаў маўленчага адукацыйнага асяроддзя. Катэгорыі «матывацыйны», «кагнітыўны», «дзейнасны» і «рэфлексіўны» традыцыйна прынята выкарыстоўваць пры вызначэнні структуры дзейнасці, пазнавальных працэсаў або кампетэнцый. Адносна адукацыйнага асяроддзя правамерна казаць аб магчымасцях, якія забяспечваюць развіццё той ці іншай педагагічнай з’явы, рашэнне той ці іншай педагагічнай задачы.

2) Уяўляецца мэтазгодным групаванне пазначаных у мадэлі арганізацыйных прынцыпаў з прычыны іх вялікай колькасці (11 пазіцый), што дазволіла б факусіраваць увагу на ключавых момантах нармавання педагагічнай дзейнасці пры стварэнні маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору. Акрамя гэтага, не зусім ясна, што аўтар разумее пад выразам «*інварыятыўныя* патрабаванні» (на с. 13 аўтарэферата адзначаецца, што арганізацыйныя прынцыпы «адлюстроўваюць інварыятыўныя патрабаванні да працэсу стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя»; у навукова-педагагічнай літаратуры часцей за ўсё выкарыстоўваюцца тэрміны «інварыянтны» і «варыятыўны».

3) На наш погляд, у прадстаўленай схеме мадэлі стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя (с. 12 аўтарэферата і с. 46 дысертацыі) недастаткова поўна паказаны «Выніковы блок»: не адлюстраваны ўзроўні, адсутнічае каментарый адносна таго, што крытэрыі ацэнкі эфектыўнасці маўленчага адукацыйнага асяроддзя прыраўноўваюцца да крытэрыяў ацэнкі сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў.

4) Недастаткова дыферэнцыраваны і недастаткова ясна сфармуляваны паказчыкі сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, якія канкрэтызуюць крытэрый «Праяўленне цікавасці да вывучэння беларускай мовы» (маецца на ўвазе «*Месца вучэбных прадметаў* "Беларуская мова", "Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)" сярод іншых прадметаў», «*Адносіны* да вывучэння прадметаў "Беларуская мова", "Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)"», «*Узровень цікавасці* да вывучэння прадметаў "Беларуская мова", "Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)"»). Сэнс паказчыкаў у цэлым зразумелы, аднак іх назвы, на наш погляд, маюць патрэбу ў больш выразнай фармулёўцы.

5) Пры апісанні канстатуючага эксперымента ў дысертацыі прадстаўлены вынікі вывучэння ўзроўню сфарміраванасці ў вучняў слоўнікавага запасу (рысунак 2.2), маўленчых уменняў (рысунак 2.3), камунікатыўных уменняў (рысунак 2.4.). Паводле прадстаўленых даных нізкі ўзровень зафіксаваны ў 100% вучняў кантрольнай і эксперыментальнай груп. У гэтай сувязі ўзнікае шэраг пытанняў. Наколькі валідныя і надзейныя выкарыстаныя методыкі? Ці апраўдана іх выкарыстанне ў I класе? Чым, на думку саіскальніка, абумоўлены выяўлены нізкі ўзровень даследуемых параметраў: слабым валоданнем дзецьмі беларускай мовай або ў цэлым узроўнем развіцця першакласнікаў? Як дыягнастычныя методыкі, якія выкарыстоўваюцца на кантрольным этапе эксперыменту,

карэлююць са зместам вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» у ІІ класе?

**Адпаведнасць (неадпаведнасць) навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**

Аналіз навуковага даследавання, праведзенага саіскалькам, дазваляе зрабіць выснову, што дысертацыя Н.У. Мурашкі «Мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі» з'яўляецца самастойнай завершанай арыгінальнай педагагічнай працай, якая ўносіць уклад у тэорыю і методыку навучання і выхавання на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання. Прадстаўленыя Н.У. Мурашкай матэрыялы сведчаць аб тым, што кваліфікацыя саіскальніка адпавядае вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання (вучнёўскай і студэнцкай моладзі).

**Навуковыя вынікі, за якія саіскальніку можа быць прысуджана вучоная ступень**

Экспертыза дысертацыі, аўтарэферата, публікацый па тэме даследавання, а таксама матэрыялаў, якія пацвярджаюць практычную рэалізацыю атрыманых вынікаў у адукацыйным працэсе, дазваляе зрабіць выснову аб тым, што вучоная ступень кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання (вучнёўскай і студэнцкай моладзі) можа быць прысуджана Н. У. Мурашцы за сукупнасць наступных навуковых вынікаў:

– удакладненне сутнасці і структуры маўленчага адукацыйнага асяроддзя ў кантэксце междысцыплінарных ведаў, што пашырае навуковыя ўяўленні аб сутнасці і ўмовах развіцця білінгвальнай асобы ў малодшым школьным узросце;

– выяўленне і абгрунтаванне патэнцыялу фальклору як сродку мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя, што садзейнічае ўзбагачэнню зместу, метадаў і форм навучання і выхавання на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі;

– распрацоўку структурна-функцыянальнай мадэлі стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання, што адлюстроўвае асноўныя функцыі маўленчага адукацыйнага асяроддзя (матывацыйная, адукацыйная, камунікатыўная, дыягнастуючая) і мае лаканічны

і дастатковы кампаненты склад (мэтавы, рэгулятыўны, змястоўны, працэсуальны і выніковы блокі);

– распрацоўку і апрабацыю ў адукацыйным працэсе пачатковай школы модульнай методыкі фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў праз вывучэнне фальклору, што выступае механізмам і інструментам стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя на практыцы.

Афіцыйны апанент:
метадыст цэнтра ацэнкі якасці адукацыі
дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія адукацыі»,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт М.Б. Гарбунова

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ГОСУДАРСТВЕННОЕ УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ «АКАДЕМИЯ ОБРАЗОВАНИЯ»
ОТДЕЛ КАДРОВ
Подпись Гарбуновой М.Б.
заверяю.
Начальник отдела С.И. Шестопалова
«20» 10 2025 г.